Источник: **«Літаратура і мастацтва» - 2012-04-26**

# Даследчык, філосаф, філолаг

**Прэзентацыя новай кнігі ўжо даўно перастала быць справай надзвычайнай у беларускай культурнай прасторы. Але калі прадстаўленне выдання спалучаецца з кніжнай выстаўкай, а таксама са святкаваннем юбілею аўтара, можна казаць пра новы жанр імпрэзы. Менавіта такая падзея "змешанага" фармату адбылася ў** Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН Беларусі**.Тут прайшлі адкрыццё выстаўкі "Творчая лабараторыя даследчыка: каштоўнасці кніжна-пісьмовай культуры" і прэзентацыя кнігі "Паэтыка і семіётыка публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI — XVII стст.", прымеркаваныя да 50-годдзя філолага, гісторыка і філосафа, доктара філалагічных навук  Івана Саверчанкі.**

— Мы адзначаем юбілей навукоўца, які зрабіў велізарны ўклад у развіццё і даследаванне гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа, — падкрэсліў акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтва НАН Беларусі, доктар гістарычных навук Аляксандр Каваленя.

Складана не пагадзіцца з шаноўным навукоўцам, бо на рахунку Івана Васільевіча — больш як 250 навуковых артыкулаў, манаграфій, вучэбных дапаможнікаў. Гэтыя выданні, а таксама кнігі, якія даследаваў юбіляр і якія сталі крыніцай яго навуковага натхнення, аб'ектам творчых пошукаў, былі прадстаўлены на выстаўцы. Сярод іх — каштоўныя помнікі кніжнай культуры Беларусі XVI — XVII стст., што захоўваюцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН Беларусі. Тут і знакамітая "Брэсцкая Біблія" 1563 г., першае беларускае друкаванае "Евангелле вучыцельнае" 1569 г., свецкія выданні гэтага часу, а таксама новыя кнігі, да выхаду якіх спрычыніўся Іван Саверчанка.

— Сённяшняя прэзентацыя кнігі — незвычайная, бо мы маем справу з навуковым выданнем, прысвечаным даследаванню старажытнага беларускага пісьменства, — зазначыў дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы НАН Беларусі, доктар філалагічных навук Аляксандр Лукашанец. — Гэта вельмі важна, бо на пачатку XXI ст. нам неабходна вяртанне гістарычнай спадчыны, культурнай памяці. Новае выданне, як і многія іншыя даследаванні, што належаць пяру аўтара — важны ўнёсак у гэтую справу. Больш за тое, Іван Васільевіч актыўна працуе ў галіне прапаганды нашай культурнай, кніжнай спадчыны за межамі Беларусі.

— Тэарэтычныя абагульненні, выкладзеныя ў манаграфіі Івана Саверчанкі "Паэтыка і семіётыка публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI — XVII стст.", "адстойваліся", фармуляваліся на працягу многіх гадоў, — падкрэсліў намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы НАН Беларусі Сяргей Гаранін. — Першыя даследаванні аўтара былі пераважна работамі гістарычнага характару, змяшчалі больш фактаграфічных звестак, аналізу твораў.

Каб павіншаваць Івана Саверчанку з юбілеем і выхадам новай манаграфіі, на вечарыну завіталі яго калегі з Інстытута мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, Белдзяржуніверсітэта, творцы-паплечнікі з Саюза пісьменнікаў Беларусі.

*Марына ВЕСЯЛУХА*